*Д. А. Доўгаль* (УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»)

# ДАПАМОЖНІКІ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ДА АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: КРЫТЫЧНЫ АГЛЯД

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны разгляду дапаможнікаў для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Раскрыта структура, прааналізаваны змест, выяўлены недахопы дадзеных вучэбных выданняў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.

Адной з распаўсюджаных форм пазакласнай работы, скіраванай на сістэматызацыю і паглыбленне ведаў вучняў, з'яўляюцца прадметныя алімпіяды. Сярод педагогаў існуе попыт на дапаможнікі, прызначаныя для арганізацыі і правядзення алімпіяд на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Асабліва запатрабаваныя матэрыялы па падрыхтоўцы да інтэлектуальных конкурсаў па беларускай мове, паколькі па гэтай дысцыпліне настаўнікі не могуць скарыстацца дапаможнікамі замежных, перадусім расійскіх, спецыялістаў. Вырашэнню гэтай актуальнай задачы садзейнічаюць вучэбныя выданні, прысвечаныя арганізацыі алімпіяднай дзейнасці ў пачатковай школе.

У 2008 годзе ў выдавецтве "Жаскон" выдадзены дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў "125 алімпіядных заданняў па беларускай мове для вучняў пачатковых класаў" (укладальнік А. У Хмялеўская) [1]. У выданні змешчаны заданні, якія могуць быць выкарыстаны "для арганізацыі і правядзення алімпіяд, гуртковых заняткаў, а таксама для самастойнага вывучэння беларускай мовы" [1, с. 3]. Прапанаваныя заданні не структурыраваны па класах або па тэматычных раздзелах курса беларускай мовы. Аналіз зместу дапаможніка дазваляе выявіць, што найбольшая частка пададзеных практыкаванняў адпавядае праграмнаму раздзелу "Слова" і скіравана на пашырэнне лексічнага запасу, засваенне структуры слова і замацаванне ведаў па часцінах мовы. У дапаможніку прадстаўлены як аналітычныя, так і сінтэтычныя заданні па тэмах "Гукі мовы. Літары" (у тым ліку арфаграфічныя) і "Сказ" (уключна з практыкаваннямі па пунктуацыі). Несумненным плюсам моўнага матэрыялу заданняў з'яўляецца наяўнасць значнай колькасці ўстойлівых адзінак – фразеалагізмаў, прыказак, прымавак, а мінусам – недастатковая прадстаўленасць тэкставага матэрыялу: толькі тры практыкаванні са 125 складзены на аснове вершаваных і празаічных тэкстаў. Істотны недахоп дадзенага выдання – значная колькасць некарэктных адказаў, а таксама памылкі ў моўным матэрыяле заданняў. Так, адзначаны адступленні ад арфаграфічных (*падваконнік* замест *падаконнік* (з. 82)), марфалагічных (*пасля ліўня* замест *ліўню* (з. 47), *лісце* як форма множнага ліку назоўніка *ліст* (з. 98)), сінтаксічных (*у двух кроках* замест *за два крокі* (з. 45)), фразеалагічных (прапанаваны ўстойлівыя адзінкі, якія адсутнічаюць у мове, – *біць баклушы* (з. 115), *працаваць не складаючы рук* (з. 119)) і іншых норм. У цэлым не менш як 20 працэнтаў ад усіх заданняў дапаможніка маюць падобныя недакладнасці.

Аўтарам дапаможніка "Алімпіяда па беларускай мове: 2-4 класы" [2] з'яўляецца настаўнік ДУА "Гімназія № 2 г. Салігорска" А. Л. Сямак. Дапаможнік, падрыхтаваны выдавецтвам "Аверсэв", быў выдадзены

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

двойчы (у 2015 і 2016 гадах), што сведчыць пра запатрабаванасць падобнай прадукцыі. Матэрыял дапаможніка складаецца з заданняў, спарадкаваных па тэмах, і дзесяці варыянтаў алімпіядных работ. Да ўсіх заданняў у дапаможніку прадугледжаны даведкі. У выданні не толькі прадстаўлены ўсе раздзелы школьнай праграмы, якія вывучаюцца на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, але і змешчаны творчыя заданні, лінгвістычныя гульнявыя задачы (анаграмы, метаграмы, лагагрыфы, шарады, паліндромы), а таксама прадугледжана знаёмства з перакладнымі слоўнікамі. Матэрыял дапаможніка насычаны займальнымі па форме і змесце практыкаваннямі, разнастайнымі наглядными сродкамі – ілюстрацыямі, схемамі, табліцамі. Прапанаваныя варыянты алімпіядных работ з'яўляюцца закончанымі комплексамі, якія можна выкарыстоўваць для правядзення конкурсаў сярод вучняў 4-га класа. Кожны такі комплекс змяшчае ад сямі да дзевяці заданняў, у тым ліку практыкаванне на пераклад з рускай мовы і заданне займальнага характару. На жаль, аўтару не ўдалося пазбегнуць парушэнняў дыдактычнага прынцыпу даступнасці: напрыклад, у заданні № 4 (тэма "Гукі мовы") вучням прапануецца ахарактарызаваць гукі ў словах з асіміляцыяй па мяккасці (*змяя, песня*), а ў заданні № 13 гэтай жа тэмы матэрыялам для назірання служаць словаформы з прыпадабненнем шыпячых гукаў да свісцячых (*мышцы, кошцы, лыжцы*), што не прадугледжана школьнай праграмай па беларускай мове.

Апошнім па часе з'яўлення вучэбным выданнем, прызначаным для арганізацыі работы па падрыхтоўцы да алімпіяды ў пачатковых класах, з'яўляецца калектыўная праца В.І. Паўлоўскай, А.А. Пікун, М.І. Варабей і А.С. Рабковай, якая пабачыла свет у выдавецтве "Содействие" ў 2016 годзе, – "Падрыхтоўка да алімпіяд па беларускай мове. 2–4 класы" [3]. Гэты дапаможнік мае адметную структуру, якая паклікана дапамагчы настаўнікам метадычна пісьменна арганізаваць працу па падрыхтоўцы да алімпіяды. Аўтарамі прадугледжаны наступныя зместавыя блокі:

– уводзіны (з указаннем актуальнасці выдання і пералікам прадметных і вучэбна-пазнавальных кампетэнцый, якія мусяць быць сфарміраваныя ў школьнікаў),

– парады па выяўленні адораных вучняў і заданні для правядзення адборачнага тура алімпіяды па беларускай мове;

– падрыхтоўка да алімпіяд (складаецца з шэрагу тэм, кожная з якіх мае наступную структуру: апісанне асноўных паняццяў, тыпалогія эфектыўных заданняў, рэкамендацыі па іх выкананні з прыкладамі, падборка аналагічных заданняў па тэме для кожнага класа з адказамі);

– алімпіядныя работы па беларускай мове для кожнага класа (па дзве работы ў двух варыянтах) з адказамі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Падобнай дэталёва распрацаванай структуры не мае ніводзін вядомы нам дапаможнік па падрыхтоўцы да алімпіяды па беларускай мове на розных ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. Адзначым таксама, што ні ў адным з аналагічных выданняў не прадугледжана дыягностыка развіцця інтэлектуальных здольнасцей вучняў. Аўтары справядліва заўважаюць, што “вынікі любой дыягностыкі – прыступка да арганізацыі карэкцыйнай і стымулюючай працы з вучнем па індывідуальнай праграме” [3, с. 13]. Выданне адметнае наяўнасцю літаратуразнаўчых, творчых, лінгвістычных гульнявых заданняў. Выкарыстанне дадзенага дапаможніка дазволіць настаўнікам арганізаваць сістэмную падрыхтоўку філалагічна адораных вучняў у адпаведнасці з праграмнымі патрабаваннямі па мове і літаратурным чытанні. Паступовае ўзрастанне складанасці, наяўнасць займальных і творчых заданняў робяць выданне сродкам развіцця маўлення і мыслення малодшых школьнікаў, павышаюць цікавасць да вывучэння роднай мовы. Адпаведнасць школьнай праграме і развіццёвы характар зместу дазваляюць выкарыстоўваць дапаможнік у якасці сродку навучання на факультатыўных занятках і ў іншых формах пазакласнай дзейнасці па прадмеце.

Такім чынам, агляд вучэбных выданняў 2008–2016 гадоў, прызначаных для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, сведчыць пра павышэнне іх якасці, што выражаецца ва ўскладненні структуры, удасканаленні метадычнага напаўнення і моўнага матэрыялу дапаможнікаў. Разам з тым, выяўленыя недахопы патрабуюць ад настаўнікаў крытычнага стаўлення да вучэбных выданняў і творчага падыходу пры іх выкарыстанні.

## Літаратура


1. 125 алімпіядных заданняў па беларускай мове для вучняў пачатковых класаў : дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў / уклад. А. У. Хмялеўская. – Мінск : Жаскон, 2008. – 44 с.
2. *Сямак, А. Л.* Алімпіяды па беларускай мове. 2–4 класы / А.Л. Сямак. – 2-е выд. – Мінск : Аверсэв, 2016. – 125 с.
3. Падрыхтоўка да алімпіяд па беларускай мове. 2–4 класы / В.І. Паўлоўская [і інш.]. – Мазыр : Содействие, 2016. – 216 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова